Нэлі РАДЗЬКО

## #ВЫСТАВЫ



Фота Ксеніі Мясаедавай

Падчас урачыстага адкрыцця

**Вытанчанасці яе манеры пісьма, няўрымсліваму палёту фантазіі і неверагоднаму працалюбству можна складаць літаратурныя паэмы…**

Вядомая навапалацкая мастачка, член Беларускага саюза мастакоў, выкладчык кафедры архітэктуры і дызайну Полацкага дзяржуніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай Марына Круглікава адкрыла новую персанальную выставу «Медытацыя».

Карціны таленавітай навапалачанкі здзіўляюць і натхняюць адначасова. Яна працуе тушшу і пяром, ствараючы сапраўды ўнікальныя вобразы навакольнага свету. «*Лініі – маё натхненне. Але я не імкнуся ўкладаць у іх разнастайнасць сэнсаў і вобразаў. Тое, што вы бачыце у сюжэтах карцін – гэта не пра мяне, гэта пра вас*», – адказваючы на пытанні шматлікіх гасцей экспазіцыі, сказала аўтар.

У галіне станковай графікі Марына Леанідаўна працуе шмат гадоў. Яе работы знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, у полацкай мастацкай галерэі, музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка. Сваю першую персанальную выставу яна прадставіла публіцы 30 гадоў таму. Павіншаваць майстра з юбілеем творчасці і выказаць сваё захапленне прыйшла начальнік аддзела культуры гарвыканкама Наталля Сцегашова. Шмат шчырых слоў Марыне Круглікавай адрасавалі калегі, сябры, вучні, аматары яе таленту. Ад сардэчнасці пачутага галоўная гераіня вечара нават расчулілася.



*Юлія Петухова з педагогам Ірынай Вялюга*

***Да канца кастрычніка ў СШ №4 працуе персанальная выстава вучаніцы 5 класа ДМШ імя І. Ф. Хруцкага, лаўрэта прэстыжнага рэспубліканскага дзіцяча-юнацкага конкурсу «Вобраз Радзімы любай» Юліі Петуховай «Свабода колеру».***

Кампазіцыі юнай мастачкі адрозніваюцца ўпэўненай манерай пісьма і шматграннасцю сюжэтаў. На яе карцінах можна пабачыць як вясковыя краявіды, так і трагічныя моманты Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівае месца ў творчасці дзяўчыны займаюць партрэты гістарычных асоб мінуўшчыны. Адкрывае выставу вялікае палатно, прысвечанае знакамітаму беларускаму першадрукару Францыску Скарыне. Поруч з асветнікам – нябесная заступніца Беларусі, Прападобная Еўфрасіння Полацкая.

Для стварэння карцін Юлія выкарыстоўвае гуаш і пастэль, з захапленнем і працавітасцю фарміруе свой творчы почырк пад кіраўніцтвам педагогаў Ірыны Вялюга, Аксаны Малюшыцкай, Ірыны Башун.